УДК 37(476)(091)«15/16»

***Андрэй Фёдаравіч Самусік***
*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. эканамічнай гісторыі*
*Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта*
***Andrey Samusik***
*Candidate of Historical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Economic History*
*of Belarus State Economic University*
e-mail: a.f.samusik@gmail.com

# РОЛЯ І. ПАЦЕЯ Ў СТВАРЭННІ ЎНІЯЦКАЙ АДУКАЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVI – ПАЧАТКУ XVII СТ.

*Навуковы артыкул прысвечаны нераспрацаванай у гістарыяграфіі праблеме станаўлення ўніяцкай адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVI – пачатку XVII ст. з вызначэннем ролі ў гэтым працэсе І. Пацея. Прааналізаваны намаганні кіеўскага мітрапаліта па адкрыццю школ у Брэсце, Слуцку, Супраслі, Полацку і Вільні. Адзначаны асобы з яго бліжэйшага акружэння, якія прынялі непасрэдны ўдзел у рэалізацыі гэтых праектаў (П. Аркудый, І. В. Руцкі і інш.). Вызначаны перашкоды на шляху арганізацыі ўніяцкіх навучальных устаноў – супраціўленне праваслаўнага насельніцтва і кальвіністаў, якія іх падтрымалі фактычная адсутнасць дапамогі з боку ўлад ды эліты, недахоп уласных рэсурсаў. Асобна разгледжаны захады І. Пацея па ўвядзенню практыцы навучання айчыннай уніяцкай моладзі ў папскіх алюмнатах (Брунсберг, Грац).*

## I. Potey's Role in the Creation of Uniate Education on the Territory of Belarus in the Late XVI – Early XVII Centuries

*The scientific article is devoted to the problem of formation of Uniate education on the territory of Belarus in the late XVI – early XVII centuries, which has not been worked out in historiography, with the definition of the role of I. Potey in this process. The article analyzes the efforts of the Metropolitan of Kiev to open schools in Brest, Slutsk, Suprasle, Polotsk and Vilna. Persons who took a direct part in the implementation of these projects are noted. Identified obstacles to the organization of Uniate schools – the resistance of the Orthodox population, the lack of assistance from the authorities and the ruling elite, and the lack of their own resources. I. Potey's measures to introduce the practice of teaching Uniate youth in the papal aluminates are considered separately.*

Апошнія дзесяцігоддзі XVI ст. сталі тым перыядам, калі на тэрыторыі Беларусі пачалі інтэнсіўна стварацца свецкія школы. Пратэстанты (кальвіністы і арыяне), каталікі (езуіты) ды праваслаўныя (брацтвы) імкнуліся абараніцца ад уплыву іншых канфесій і лепшым сродкам для гэтага лічылі менавіта належнае выхаванне моладзі. Уніяцкая царква распачала асветніцкую дзейнасць пазней за сваіх канкурэнтаў і спрабавала кампенсаваць адставанне не толькі адкрываючы новыя навучальныя ўстановы, але і захопліваючы праваслаўныя адукацыйныя асяродкі. Значныя намаганні ў гэтых напрамках прыклаў менавіта ўраджэнец Берасцейшчыны кіеўскі мітрапаліт І. Пацей.

На жаль, у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі перыяд станаўлення ўніяцкай адукацыі ў канцы XVI – пачатку XVII ст. амаль не вывучаны. Увага даследчыкаў найперш звернута на асветніцкія захады базыльянскага ордэну, які быў створаны ў 1617 г. Такі падыход акцэнтуе ўвагу толькі на шэрагу значных падзей (Брэсцкая школа, прывілей ад 31 сакавіка 1613 г.), але фактычна пакідае па-за межамі даследчага інтарэсу агульны аналіз першых дзеянняў уніятаў па арганізацыі школьнай справы [1, с. 88–90; 2, с. 18]. Намаганні І. Пацея па развіцці ўніяцкай адукацыі засталіся па-за межамі не толькі прац, якія аналізуюць мінулае айчыннай асветы, але і прац, непасрэдна прысвечаных яго асобе, дзе больш даследуецца яго літаратурная і рэлігійная дзейнасць, а ўдзел у пашырэнні школьнай справы толькі адзначаецца [3, с. 29].

Мэта прадстаўленага навуковага артыкула – усебаковы разгляд першых мерапрыемстваў кіраўніцтва ўніяцкай царквы па стварэнні ўласнай сеткі навучальных устаноў праз прызму адпаведнай дзейнасці І. Пацея на пасадах брэсцка-ўладзімірскага

епіскапа і кіеўскага мітрапаліта. Для яе дасягнення пастаўлены наступныя задачы: 1) разгледзець спробы адкрыцця І. Пацеем школ у Брэсце, Слуцку, Супраслі, Полацку і Вільні; 2) адзначыць асоб з яго бліжэйшага акружэння, якія прынялі непасрэдны ўдзел у рэалізацыі гэтых праектаў; 3) прааналізаваць намаганні іерарха па арганізацыі замежных адукацыйных стажыровак; 4) асэнсаваць агульныя вынікі намаганняў І. Пацея па пашырэнню ўніяцкай асветы.

Яшчэ напярэдадні заключэння ўніі адукацыйныя пытанні востра гучалі ў асяроддзі царкоўных іерархаў, якім вельмі не падабаўся кантроль над школамі свецкіх колаў праваслаўнага грамадства. Менавіта таму, калі 1 ліпеня 1595 г. кіеўскі мітрапаліт М. Рагоза і іншыя вышэйшыя саноўнікі падпісалі папярэднія ўмовы злучэння з каталіцкай царквою, то асобна агаварылі падпарадкаванне ім брацтваў і права на адкрыццё навучальных устаноў. 2 жніўня 1595 г. дадзенае пагадненне зацвердзіў кароль Жыгімонт III Ваза, у грамаце якога азначаныя пытанні атрымалі наступную фармулёўку: «Брацтва духовные церковные… абы под послушенством митрополита и иных преложоных своих духовных вцале зоставали… закладанья школ и семинарий Греческого и Словенского языка… под владзою Митрополита и Владыков, позволяем» [4, арк. 5–6].

Пасля Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. асветніцкае пытанне не стала адразу ж прыярытэтным з-за праблем у справе фактычнага яе ўвядзення. М. У. Дзмітрыеў з гэтай нагоды пісаў: «Униатскую церковь пришлось строить шаг за шагом, отвоевывая… приход за приходом и монастырь за монастырем» [5, с. 87]. У выніку першай праявай дзеянняў уніяцкай царквы ў сферы адукацыі быў захоп праваслаўных навучальных устаноў, што пераходзілі пад яе кантроль разам з царквамі ды манастырамі. Карысць ад гэтага бачылася ў магчымасці аслабіць праваслаўную царкву, а таму школы найперш успрымаліся ў выглядзе сродку ідэалагічнай барацьбы, а не цэнтра асветы вернікаў.

Першым з уніяцкіх іерархаў, хто здзейсніў канкрэтныя захады па перахопе адукацыйнай ініцыятывы ў іншых канфесій, стаў І. Пацей. Ён паходзіў са старажытнага шляхецкага роду і нарадзіўся ў 1541 г. у сядзібе Ражанка пад Брэстам. Яго выхаванне пачалося ў сярэдзіне 1550-х гг. пры двары канцлера ВКЛ князя Мікалая Радзівіла Чорнага. Гэта паспрыяла пераходу юнака з праваслаўя ў кальвінізм і падрыхтавала да паступлення ў Віленскую кальвінскую гімназію (пазней вучыўся ў Кракаўскім універсітэце). У 1574 г. ён вярнуўся ў праваслаўе і ў 1588 г. заняў пасаду кашталяна Брэста. Аднак у красавіку 1593 г. прыняў манаскі пострыг пад імем Іпацій (свецкае імя – Адам) [6, с. 59]. 3 мая гэтага ж года быў прызначаны на пасаду епіскапа брэсцка-ўладзімірскага. У каралеўскім рэскрыпце на заняцце ім гэтай пасады адзначалася валоданне «умеетностью в письме водлуг закону греческого» [7, арк. 1–2].

У галоўных гарадах епархіі І. Пацей пераўтварыў праваслаўныя навучальныя ўстановы ва ўніяцкія: такі лёс напаткаў саборнае вучылішча ва Уладзіміры-Валынскім і брацкую школу ў Брэсце. У Брэсце ж ён распачаў барацьбу з брацтвам яшчэ да заключэння ўніі. Калі частка мясцовых настаўнікаў з’ехала ў Вільню (Л. Зізаній і інш.), епіскап заявіў аб поўным заняпадзе навучальнай установы. У лісце ад 25 сакавіка 1595 г. ён пісаў князю К. К. Астрожскаму: «Сия школа разорилася через самых же професоров школьных, которые за лакомством удавшися до Вильни на сытые пироги отбегли». Справу ж яе «выратавання» І. Пацей узяў на сябе: ён дабіўся ад караля Жыгімонта III Вазы 26 чэрвеня 1597 г. прывілея аб перадачы апусцелых вучылішчных будынкаў ва ўласнае ведзенне: «Абы в школе Руской… лепшый порядок и наука быти могла». Зацікаўленасць улад у хуткім развіцці ўніяцкай адукацыі праявілася ў перадачы школе будынкаў, размешчаных у вёсках Таракань і Лесна ў Пінскім павеце, якія да гэтага належалі манастыру ў Жыдзічыне: «на выхованье учителей в той школе и детей людей убогих, которые ся учити будут» [8, с. 175–176].

Пасаду настаўніка플ануемай школы епіскап прапанаваў уласнаму сакратару П. Аркудыю, з якім ён пазнаёміўся яшчэ ў пачатку 1590-х гг. у час знаходжання таго ў Рэчы Паспалітай з мэтай высвятлення для Ватыкана магчымасці заключэння ўніі. Зноў яны сустрэліся ўжо ў Рыме ў 1596 г., дзе І. Пацей і запрасіў яго да сябе на службу. Ураджэнец Корфу П. Аркудый быў адным з першых выпускнікоў Рымскай Грэчаскай

калегіі, дзе правучыўся 14 гадоў (1578–1591) і атрымаў ступені доктара філасофіі ды тэалогіі. Згода «в науках Греческих беглого» П. Аркудыя заняць пасаду настаўніка была атрымана, і каралеўскім рашэннем ад 23 жніўня 1599 г. прыбыткі ад в. Таракань замацоўваліся за ім «на содержание во время отправления учительской должности в Брестской школе». Гэта вёска давалася яму «до живота своего, не будучи повинен нам и никому иншому жадной повинности с того села полнити, опроч, кгды коллегиум альбо семинариум для науки людей молодых религии Греческой там заложено будет… повинен будет научати их, ведучи до добрых обычаев и веры старожитной Греческой» [8, с. 195–196].

Можна меркаваць, што менавіта Брэсцкае вучылішча пэўны час бачылася І. Пацею ў якасці асноўнага цэнтра уніяцкай адукацыі ў ВКЛ. Аднак прызначэнне ў 1599 г. кіеўскім мітрапалітам прымусіла іерарха клапаціцца аб дабрабыце і культурным развіцці ўсёй царквы. Пры гэтым ён абапіраўся на падтрымку караля Жыгімонта ІІІ Вазы, які ў грамаце ад 8 красавіка 1600 г. загадваў духавенству: «Велебного Ипатия за старшого пастыра и митрополита своего принявши, оному вшелякое послушенство и учтивость прыстойную отдавати» [9, арк. 1–3].

Яшчэ да выхаду дадзенага загаду І. Пацей паспрабаваў узяць пад уласны кантроль праваслаўны духоўна-асветніцкі асяродак у Слуцку. 28 снежня 1599 г. апякун князёўны С. Алелькавіч віленскі кашталян І. Хадкевіч перадаў тутэйшую архімандрыю кіеўскаму мітрапаліту. 3 чэрвеня наступнага года сюды прыбыў пратапоп А. Герасімовіч, якому было даручана і стварэнне школы. У грамаце І. Пацея случанам гаварылася: «Естли бысте в чом были неведомы, от него науку пристойную взяли» [10, арк. 1–2]. 1 кастрычніка 1600 г. С. Алелькавіч выйшла замуж за кальвініста падчашыя літоўскага князя Я. Радзівіла, які па просьбе жонкі выгнаў уніятаў са Слуцка. І. Пацею ж засталося толькі скардзіцца ў лісце ад 31 снежня 1600 г. ваяводзе троцкаму князю М. К. Радзівілу Сіротцы аб аднаўленні ў Слуцку «проклятой схизмы», «насмешках и издевательствах врагов святого единства» ды «гибели душ человеческих» [11, с. 394–395].

Паспрабаваў І. Пацей утварыць новы ўніяцкі асветніцкі цэнтр у Полацку. У час арганізацыі тут каралём Стэфанам Баторыем езуіцкага калегіума ў 1581 г. ён аддаў ордэну шэраг маёнткаў, што належалі мясцовым праваслаўным царквам, бо яны не мелі адпаведных дакументаў на іх (былі вывезены ў час Лівонскай вайны ў Маскву). Такі ўчынак выклікаў незадавальненне ў мясцовага насельніцтва, якое яшчэ і напрыканцы XVI ст. патрабавала выгнання езуітаў з Полацка. Гэтае пытанне было ўзнята на сойме 1587 г., таму І. Пацей і прапанаваў кампраміснае рашэнне: замяніць езуіцкі калегіум на ўніяцкую семінарыю з перадачай ёй спрэчнай зямельнай маёмасці. Аднак кіраўнік Польскай правінцыі ордэну Б. Ганфаланьеры здолеў пераканаць улады ў неабходнасці захавання ў Полацку ўласнай навучальнай установы [12, с. 182].

Не вельмі ўдала для І. Пацея развіваліся справы ў іншым праваслаўным культурным асяродку – Супрасльскім манастыры. Для яго захопу кіеўскі мітрапаліт абвінаваціў тутэйшага архімандрыта І. Масальскага ў непадпарадкаванні і замяніў на свайго стаўленіка іераманаха Герасіма. Прычым той у прысязе 2 красавіка 1603 г. паабяцаў не толькі асабіста падпарадкоўвацца мітрапаліту, але яшчэ і выгнаць з манастыра ўсіх інакаў, нязгодных з ім. Асобна ён падкрэсліваў, што забараніць практыку чытання манахамі кніг «еретических, лютерских, евангелицкого и иных нововерников». Адкрыць тут школу І. Пацей усё ж не здолеў па прычыне адсутнасці дасведчаных настаўніцкіх кадраў [13, арк. 1–4].

Вяртаючыся ж да гісторыі знаходжання ўніятаў у Брэсце, неабходна адзначыць, што разам з І. Пацеем горад пакінуў і П. Аркудый, атрымаўшы прыбытковыя пасады архімандрыта Лаўрышаўскага і Кобрынскага манастыроў. У выніку праца па арганізацыі ўніяцкай школы ў Брэсце была згорнута [14, с. 194–197]. Пра тое, што ўніяты ў Брэсце ўвогуле не распачалі асветніцкай дзейнасці, сведчыць каралеўская грамата ад 20 снежня 1613 г. У ёй адзначалася, што І. Пацей «упросил был у нас село Тороканы, в повете Пинском лежачое, на школу Берестейскую, которое-то школы не заложивши с сего света зшол». Па гэтай прычыне, а таксама таму, што П. Аркудый назаўсёды з'ехаў з краіны (у 1613 г. ён вярнуўся ў Рым, дзе працаваў у бібліятэцы Ватыкана), было вырашана «тым селом под-

перти» Віленскі Троіцкі манастыр, бо «в оном значне прибывает людей законных, в побожности и в науках вызволеных поступуючих» [15, с. 10–11].

Як бачна, рашэнне аб передачы в. Таракань Віленскаму Троіцкаму манастыру было абумоўлена наяўнасцю ў ім адукацыйнага цэнтра, стварэннем якога таксама займаўся І. Пацей пасля свайго прызначэння на пасаду кіеўскага мітрапаліта. Па яго хадайніцтву ў 1600 г. віленскі біскуп Б. Война выдзяліў 5 тыс. фларынаў для набыцця драўлянага будынку, разлічанага на 12 семінарыстаў. Сам І. Пацей для лепшага фінансавага забеспячэння Віленскай семінарыі 15 жніўня 1601 г. перадаў ёй фальварак Пячэрск у Аршанскім павеце: «Для твиченья людей молодых так законных, яко и свецких» [16, арк. 1–6].

Кіраваць семінарыяй мітрапаліт зноў прапанаваў П. Аркудыю, але той скептычна аднёсся да прапановы: «Што можа зрабіць такі маленькі семінарчык у такім вялікім каралеўстве і на такой вялікай зямлі?». Таму яе рэктарам быў прызначаны прыдворны духоўнік мітрапаліта П. Федаровіч-Сурамятнікаў [16, арк. 4]. Аднак у 1602 г. ён раптоўна памёр, і на першы план выйшаў І. В. Руцкі, ураджэнец Навагрудчыны, які атрымаў адукацыю ў Пражскім і Вюрцбургскім універсітэтах, а таксама ў Грэчаскай калегіі ў Рыме. Вялікі гетман ВКЛ К. Радзівіл Пярун прапанаваў яму ў якасці гувернёра сына Крыштофа адправіцца за мяжу, але зварот І. Пацея прымусіў І. В. Руцкага перагледзець уласныя планы і ўзначаліць Віленскую семінарыю ў 1603 г.

Выбар І. Пацея аказаўся дакладным. У Вільні І. В. Руцкі «то силой благочестивого слова, то примером своих добродетелей собирает около себя значительный отряд знатных юношей». Пры гэтым даўшы ім тут належную пачатковую падрыхтоўку, ён адпраўляў іх у езуіцкія калегіумы Каліша, Пултуска і Нясвіжа [17, с. 22, 25–26].

Варыянт з навучаннем у езуітаў І. Пацей, аднак, не лічыў аптымальным з-за выпадкаў пераманьвання ордэнам уніяцкай моладзі ў каталіцызм. Альтэрнатыву мітрапаліт бачыў у атрыманні стыпендый пры папскіх алюмнатах (прызначаліся для падрыхтоўкі да місіянерскай працы сярод іншаверцаў). Аб станоўчым выніку падобных намаганняў сведчыць ліст папскага нунцыя ў Рэчы Паспалітай Ф. Сіманэці, які 28 жніўня 1607 г. пісаў І. Пацею: «Его Императорское Величество (Рудольф II. – *А. С.*)… согласился допустить к поступлению в Гратский алюмнат (что в Штирии) двух юношей униатов из Вашей страны для обучения наукам». Аднак няма звестак, скарыстаў І. Пацей магчымасцю даслаць кагосьці ў Грац ці не [18, с. 192–193]. Затое дакладна вядома, што ён распачаў прыктыку накіравання на вучобу ўніятаў у алюмнат Брунсберга ў Варміі. Так, 26 жніўня 1609 г. сюды паступіў будучы мінскі архімандрыт А. Пакоста, які прабыў тут да 1611 г. Таксама ў Брунсбергу вучыліся: Ігнат (1609–1610), Г. Хмяльніцкі (1611–1612), дыякан Феадосій і інак Віленскага Троіцкага манастыра Макарый (абодва ў 1611–1615) [19, с. 64–69].

Не выклікае сумненняў, што намаганні І. Пацея ў сферы стварэння ўніяцкай адукацыі паступова пачалі даваць станоўчыя вынікі. Няўнасць Віленскай семінарыі і замежных адукацыйных стыпендый заклалі яе асновы. Вельмі важным стала тое, што яшчэ пры жыцці ён вызначыўся са сваім пераемнікам: 16 чэрвеня 1612 г. прызначыў І. В. Руцкага епіскапам галіцкім. Дачакаўся І. Пацей і афіцыйнага прызнання ўладамі сваіх дасягненняў. Яшчэ да яго смерці (18 ліпеня 1613 г.) І. В. Руцкаму ў грамаце ад 31 сакавіка таго ж году кароль Жыгімонт III Ваза дазволіў «школы в том панстве нашом… фундовать и в тых школах учыти всих наук… языком Кгрецким, Латинским, Словенским, Польским и Руским». Яны атрымлівалі «вси права, вольности и привилеи, которые школы нашы католицкие… мают» [20, с. 70–71].

Разам з тым гэты прывілей не быў падмацаваны фінансавай дапамогай, у якой уніяты адчувалі значную патрэбу. Трапна на гэты конт выказаўся Э. Лікоўскі: «Няшчасцем Уніі Брэсцкай было тое, што, маючы шматлікіх і ўплывовых ворагаў, вельмі мала яна налічвала прыхільнікаў і абаронцаў». Ён адзначаў, што кароль Жыгімонт III Ваза дапамагаў уніятам «больш маральна, чым матэрыяльна» [21, с. 219, 224]. З ліку ж магнатэрыі ВКЛ толькі канцлер Л. Сапега аказваў рэальную дапамогу ўніятам: выдзяляў фундушы манастырам і храмам, аказваў палітычную падтрымку [22, с. 238]. Відавочна, што многія няўдачы І. Пацея былі звязаны з элементарным недахопам сродкаў

і адукаваных асоб. Менавіта па гэтай прычыне згасла школа ў Брэсце, а ў Супраслі адкрыць яе ўвогуле не ўдалося. Нягледзячы на гэта, якраз канец XVI – пачатак XVII ст. можна разглядаць у якасці этапу зараджэння ўніяцкай адукацыі, а выхаваныя ў гэты час кадры забяспечылі яе далейшае развіццё ў наступныя дзесяцігоддзі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Марозава, С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / С. В. Марозава. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 352 с.
2. Pidłypczak-Majerowicz, M. Bazylianie w Koronie i na Litwie: szkoły i książki w działalnośći zakonu / M. Pidłypczak-Majerowicz. – Warszawa ; Wrocław : Państ. Wyd-wo Naukowe, 1986. – 272 s.
3. Падокшын, С. А. Іпацій Пацей. Царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе культурна-гістарычных эпох / С. А. Падокшын. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 117 с.
4. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Ф. 823. Воп. 1. Спр. 180.
5. Дмитриев, М. В. Уния и порожденные ею конфликты в осмыслении лидеров униатского лагеря / М. В. Дмитриев // Брестская уния 1596 г. и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI – первой половине XVII в. : в 2 ч. / отв. ред. Б. Н. Флоря. – М. : Индрик, 1996–1999. – Ч. 2. – 1999. – С. 87–121.
6. Лаўрык, Ю. Іпаці Пацей / Ю. Лаўрык // Спадчына. – 1992. – № 2. – С. 58–65.
7. РДГА. – Ф. 823. Воп. 1. Спр. 147.
8. Акты, относящиеся к истории Западной Руси, собранные и изданные Археографической комиссией : в 5 т. – СПб., 1846–1853. – Т. 4. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1851. – № 122. – С. 175–176.
9. РДГА. – Ф. 823. Воп. 1. Спр. 239.
10. РДГА. – Ф. 823. Воп. 1. Спр. 240.
11. Жукович, П. Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией (до 1609 г.) / П. Жукович. – СПб. : Тип. Главного Управления Уделов, 1901. – 594 с.
12. Дмитриев, М. В. Между Римом и Царьградом : генезис Брестской церковной унии 1595–1596 гг. / М. В. Дмитриев. – М. : Изд. Моск. ун-та, 2003. – 320 с.
13. РДГА. – Ф. 823. Воп. 1. Спр. 263.
14. Акты издаваемые комиссиею, Высочайше учрежденною для разбора древних актов в Вильне : в 39 т. – Вильна, 1865–1915. – Т. XXXIII. – Вильна : Русский почин, 1908. – LXXXIV, 567 с.
15. Акты, относящиеся к истории Западной Руси, собранные и изданные Археографической комиссией : в 5 т. – СПб., 1846–1853. – Т. 5. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1853. – VII, 288 с.
16. РДГА. – Ф. 823. Воп. 1. Спр. 249.
17. Турук, Ф. Униатский митрополит Иосиф Вельямин Рутский (1613–1637) и его значение в истории униатской западной русской церкви / Ф. Турук. – Петроград : Сенатская тип., 1916. – 41 с.
18. Савич, А. Западно-русские униатские школы XVI–XVIII в. / А. Савич // Пр. Беларус. дзярж. ун-та. – 1922. – № 2–3. – С. 130–197.
19. Lühr, G. Die Matrikel der päpstlichen Seminars zu Braunsberg 1578–1798 / G. Lühr. – Braunsberg : Druck der Ermländischen Zeitungs- und Verlagsdruckerei, 1925. – 213 s.
20. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной Руси : в 15 т. – СПб., 1863–1892. – Т. 2. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1865. – 287 с.
21. Likowski, E. Unia brzeska (r. 1596) / E. Likowski. – Warszawa ; Kraków : G. Gebethner i S-ka, 1907. – 355 s.
22. Чистович, И. Очерк истории западно-русской церкви : в 2 ч. / И. Чистович. – СПб. : Тип. Департамента уделов, 1882–1884. – Ч. 2. – 1884. – 419 с.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 06.10.2020*